*Думкі, заўвагі, прапановы*

# ГІСТОРЫЯ БІБЛІЯТЭК РЭСПУБЛІКІ

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна ў 1958 годзе выпусціла зборнік «Бібліятэчная справа ў БССР. З гісторыі бібліятэк рэспублікі». Паяўленне гэтага зборніка можа быць адзначана як творчы пачын, як крок наперад у стварэнні гісторыі бібліятэчнай справы ў Беларусі. У ім сабраны артыкулы па гісторыі асобных навуковых бібліятэк. Пра першую бібліятэку Гродзеншчыны, цяпер абласную бібліятэку імя Я. Ф. Карскага, расказана ў артыкуле В. Алшавай і В. Чэлік. У кнізе змешчана яшчэ некалькі цікавых артыкулаў пра бібліятэкі рэспублікі.

Толькі тры гады назад у рэспубліцы пачалася работа па напісанню гісторыі бібліятэк. Упраўленне культуры Мінскага гарвыканкома і Цэнтральная гарадская бібліятэка імя Я. Купалы прыклалі нямала намаганняў, каб усе масавыя бібліятэкі склалі свае гістарычныя нарысы. Была праведзена тэарэтычная канферэнцыя па гісторыі бібліятэчнай справы ў горадзе. Канферэнцыя рэкамендавала кожнай бібліятэцы збіраць і абагульняць матэрыялы па сваёй гісторыі і знаёміць з імі чытачоў. Аналагічная канферэнцыя адбылася ў Віцебску.

Аднак заспакоіцца на зробленым нельга. Патрэбна ўпартая праца па завяршэнню пачыну. Хацелася б, каб былі ажыццёўлены ўказанні Міністэрства культуры рэспублікі пра выдзяленне ў кожнай абласной бібліятэцы работніка, які вёў бы штодзённую арганізацыйна-кансультацыйную работу па напісанню гісторыі бібліятэк, пра ўтварэнне камісіі або групы па гісторыі бібліятэчнай справы вобласці з удзелам бібліятэчных работнікаў усіх сістэм, пра ўключэнне ў праграму гарадскіх і раённых навукова-практычных канферэнцый або семінараў паведамленняў, дакладаў па гісторыі асобных бібліятэк, бібліятэчнай справы ў горадзе, раёне, вобласці.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна рыхтуе другі зборнік, прысвечаны гісторыі гарадскіх і сельскіх масавых бібліятэк. Пажадана бачыць у такім зборніку, побач з іншымі матэрыяламі, нарысы па гісторыі развіцця прафсаюзнай бібліятэкі аднаго з вядучых прадпрыемстваў рэспублікі. Трэба спадзявацца, што культурна-масавыя аддзелы Белсаўпрофа і Мінскага аблсаўпрофа зробяць усё, каб такі нарыс быў на старонках новага зборніка.

Работа па напісанню гісторыі бібліятэк і бібліятэчнай справы павінна насіць не эпізадычны характар, а весціся сістэматычна. Практычны вопыт падказвае, што мэтазгодна мець у саставе навукова-метадычнага аддзела Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна сектар па гісторыі бібліятэчнай справы ў Беларусі. Стварэнне бібліяграфічнай картатэкі ўсіх публікацый і рукапісаў па гэтых пытаннях — адна з яго задач. На базе гэтай картатэкі магчыма ў перспектыве выданне бібліяграфічнага ўказальніка па гісторыі бібліятэчнай справы і бібліяграфіі ў БССР.

Не менш важнай задачай з'яўляецца даўкамплектаванне справаздачамі і друкаванымі каталогамі бібліятэк Беларусі.

Навукова-практычная канферэнцыя тэхнічных бібліятэк Беларусі, прыбалтыйскіх рэспублік, Калінінградскай вобласці з прадстаўнікамі Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы і Дзяржаўнай публічнай навукова-тэхнічнай бібліятэкі СССР, тэхнічных бібліятэк шэрагу іншых гарадоў краіны адобрыла вопыт Беларусі па стварэнню гісторыі тэхнічных бібліятэк. Канферэнцыя рэкамендавала кожнай тэхнічнай бібліятэцы збіраць і абагульняць матэрыял па гісторыі сваёй бібліятэкі, падрыхтаваць зборнік па гісторыі тэхнічных бібліятэк Беларусі.

Стварэнне гісторыі бібліятэчнай справы ў рэспубліцы — важная, патрэбная справа, і вырашаць яе трэба штодзённа.

**С. АШАРОВІЧ.**

ЗВЯЗДА